УДК 81’42

# МАСТАЦКІ ДЫСКУРС ЯК АБ’ЕКТ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

**Старасціна Ганна Міхайлаўна**
старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

*В статье раскрывается понятие художественного дискурса. Отмечаются спорные вопросы в данной области исследования, рассматривается соотношение понятия дискурса с понятием текста. Анализируется специфика художественного дискурса, выявляются его отличия от других видов дискурса.*

**Ключевые слова:** дискурс, текст, художественный дискурс, художественная литература, художественный текст.

*The article reveals the concept of fiction discourse. The controversial issues in this area of research have been noted, the relationship between the concept of discourse and the concept of text has been considered. The specificity of artistic discourse has been analyzed, its differences from other types of discourse have been revealed.*

**Keywords:** discourse, text, fiction discourse, fiction, literary text.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Тэрмін “дыскурс” – шматзначны тэрмін лінгвістыкі, які не мае адзінага тлумачэння ў навуковай літаратуры. Нягледзячы на сваё шырокае прымяненне ў розных навуках (лінгвістыцы, педагогіцы, сацыялогіі, псіхалогіі і г. д.), дадзенае паняцце застаецца вельмі разнастайным і не мае адназначных характарыстык [2].

Разгорнутае і шматаспектнае вызначэнне названага тэрміна прапануе Н. Д. Аруцюнава: “Дыскурс можа быць ахарактарызаваны як: 1) звязны тэкст у сукупнасці з экстралінгвістычна-прагматычнымі, сацыякультурнымі, псіхалагічнымі і іншымі фактарамі; 2) тэкст, узяты ў падзейным аспекце; 3) маўленне, якое разглядаецца як мэтанакіраванае сацыяльнае дзеянне, як кампанент, які ўдзельнічае ва ўзаемадзеянні людзей і механізмах іх свядомасці (кагнітыўных працэсах)” [1, 136–137].

Адным з самых складаных паняццяў у тэорыі дыскурсу з’яўляецца мастацкі тып дыскурсу, які мы разумеем як сукупнасць мастацкіх тэкстаў, якія разглядаюцца з улікам лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў (культурных, сацыяльных, псіхалагічных, прагматычных), істотных для іх адэкватнай інтэрпрэтацыі. У межах такога разумення дыскурс уяўляе сабой нешта большае, чым тэкст, аднак апошні – самы галоўны і важны складнік дыскурсу. У рамках дадзенага падыходу мастацкі дыскурс можна вызначыць як складаную камунікатыўную з’яву, якая ўтвараецца самім творам, яго аўтарам, адрасатам; як твор, створаны ў пэўны час, які мае канкрэтны сацыякультурны фон, характарызуецца арыгінальным стылем і адносіцца да пэўнага жанру.

У сучаснай лінгвістыцы пытанне аб суадносінах тэксту і дыскурсу з’яўляецца спрэчным. У шматлікіх сітуацыях тэрміны “дыскурс” і “тэкст” ужываюцца паралельна, альбо дапаўняюць адзін аднаго. Найбольш абагульненым спосабам адрознівання дадзеных паняццяў з’яўляецца іх прадстаўленне ў выглядзе гіпагіперанімічнай карэляцыі “агульнае – прыватнае”, у якой тэкст (прыватнае) служыць канструктыўнай адзінкай дыскурсу, а дыскурс (агульнае) – адзінкай вышэйшага ўзроўню абстракцыі, пад “дахам” якой існуе бясконцая колькасць канкрэтных і рэальных тэкстаў [5, с. 24]. З гэтага вынікае, што кожны тэкст з улікам яго камунікатыўных і экстралінгвістычных характарыстык з’яўляецца прадуктам дыскурсу, ці дыскурсам у вузкім сэнсе слова.

Мастацкі дыскурс як аб’ект даследавання валодае спецыфікай, якая адрознівае яго ад іншых відаў дыскурсу. Адна з галоўных яго прыкмет – антрапацэнтрычнасць. Чалавек займае ў мастацкім тэксце асаблівае месца, бо гэта не толькі аб’ект апісання, але і яго цэнтр, тая семантычная дамінанта, якая абумоўлівае прынцыпы арганізацыі тэксту і ў сукупнасці стварае тэкставае адзінства [4, с. 118–119].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Паняцце “дыскурс” нельга аддзяляць ад паняцця моўнай асобы. Ю. М. Караулаў лічыць, што за кожным прадуктам дыскурсу, тэкстам, стаіць моўная асоба, якая валодае сістэмай мовы [3, с. 27]. Акрамя таго, на думку К. Ф. Сядова, “за кожнай моўнай асобай стаіць мноства створаных ёю дыскурсаў” [6, с. 4].

Для мовы мастацкага дыскурсу характэрна вялікая колькасць экспрэсіўных сродкаў. Аўтар, выбіраючы той ці іншы моўны сродак, разлічвае на пэўны эмацыйны водгук чытача, а прыцягненне яго ўвагі ажыццяўляецца за кошт выкарыстання розных стылістычных прыёмаў. У іншых тыпах дыскурсу таксама можна сустрэць эматыўную лексіку, аднак для мастацкага дыскурсу яна з’яўляецца важным кампанентам, бо стварэнне пачуццёвага успрымання рэчаіснасці з дапамогай вобразных сродкаў – адна з галоўных яго функцый.

Мастацкі дыскурс не зводзіцца да простага ўзаемадзеяння аўтара і чытача. Ён нясе ў сабе элементы культуры на пэўнай стадыі развіцця грамадства. Сучаснае культурнае жыццё праламляецца праз успрыманне аўтара і перадаецца чытачу ў межах штучна створанай рэальнасці, таму ўсе выяўленыя ў мастацкім тэксце ідэі і веды носяць умоўны індывідуалізаваны характар. Такім чынам веды аўтара ператвараюцца ў канцэпты, якія можна выкарыстоўваць для больш шырокага аналізу.

Канчатковай мэтай любога дыскурсу з’яўляецца яго ўспрыманне і разуменне. Пры гэтым кагнітыўныя механізмы разумення адлюстроўваюць не толькі лінгвістычны вопыт, але і сацыяльныя ўмовы функцыянавання мовы, а сам працэс разумення складаецца з суаднсін лінгвістычных рыс выказвання з мноствам абстрактных мадэляў, абагульняючых калектыўны вопыт носьбітаў мовы. Пад уплывам ведаў, назапашаных у культуры, фарміруецца пэўнае стандартнае ўспрыманне розных падзей і аб’ектаў, якое акумулюецца ў стэрэатыпах. Можна сцвярджаць, што для мастацкага дыскурсу характэрна наяўнасць элементаў стэрэатыпнасці, якія залежаць ад культурных установак нацыі.

Такім чынам, мы бачым, што мастацкі дыскурс уяўляе сабой унікальную з’яву і значна адрозніваецца ад іншых відаў дыскурсу.

Галоўнай спецыфікай мастацкага дыскурсу з’яўляецца тое, што ён адлюстроўвае шматлікія іншыя віды дыскурсу, не падзяляючыся на іх. Напрыклад, палітычны дыскурс, паказаны пісьменнікам, становіцца мастацкім, бо не належыць да рэальнай рэчаіснасці, а адлюстроўвае ўяўленні аўтара.

Спецыфіку мастацкага дыскурсу вызначае таксама арыентацыя на экстралінгвістычную інфармацыю, на раскрыццё ўнутранага свету асобы і выяўленне характару міжасобасных адносін.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Літаратура**

1. Арутюнова Н. Д. Дискурс / Н. Д. Арутюнова // Лингвистический энциклопедический словарь ; гл. ред. В. Н. Ярцева. – Москва : Советская энциклопедия, 1990. – С. 136–137.
2. Балабанова, Т. Н. Педагогический дискурс как разновидность дидактического / Т. Н. Балабанова // Гуманитарные научные исследования. – 2018. – № 11. – Режим доступа : URL : http://human.snauka.ru/2018/ll/25260. – Дата обращения: 12.11.2018.
3. Караулов, Ю. Н. Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – Москва : Наука, 1987. – 264 с.
4. Полищук, Г. Г. Человек в системе компонентов художественного текста / Г. Г. Полищук, К. М. Зайнутдинова, А. А. Резчикова // Вопросы стилистики : межвуз. сб. науч. тр. – Саратов : Изд-во Саратовского ун-та, 1998. – Вып. 27 – С.118–119.
5. Приходько А. Н. Таксономические параметры дискурса / А. Н. Приходько // Язык. Текст. Дискурс : Научный альманах Ставропольского отделения РАЛК / под ред. проф. Г. Н. Манаенко. – Ставрополь : Изд-во СГПИ, 2009. – Вып. 7. – С. 22–30.
6. Седов К. Ф. Становление дискурсивного мышления языковой личности : психо- и социолингвистические аспекты / К. Ф. Седов. – Саратов : Изд-во Сарат. ун-та, 1999. – 180 с.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова